

Зборнікі серыі


Скульптурная кампазіцыя "Апошні шлях" у мемарыяльным комплексе "Яма" ў Мінску


Андрэй Дзямянюк


Валерый Талкачоў

# Без тэрміну даўнасці

## Новыя дакументы аб генацыдзе

**У Нацыянальнай бібліятэцы адбылася рэспубліканская прэзентацыя шасцітомнага зборніка дакументаў "Без тэрміну даўнасці. Беларусь: злачынствы нацыстаў і іх памагатых супраць мірнага насельніцтва на акупаванай тэрыторыі БССР у гады Вялікай Айчыннай вайны". Мерапрыемства было зладжанае Дэпартаментам па архівах і справаводстве Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь.**

### УДАКЛАДНЕННЕ ЛІЧБАЎ

Дырэктар Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь Андрэй Дзямянюк распавёў, што работа над праектам заняла два гады. У адпаведнасці з канцэпцыяй серыі, кожнай вобласці краіны ў сучасных адміністрацыйна-тэрытарыяльных межах прысвечаны асобны том. У зборніках апублікаваны дакументы з архіваў Беларусі, Расіі, Германіі, Злучаных Штатаў Амерыкі, а таксама з фондаў Беларускага штаба партызанскага руху. Выкарыстоўваліся трафейныя нямецкія і амерыканскія дакументы, звесткі Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі па ўстанаўленні і расследаванні злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў, якая дзейнічала адразу пасля выгнання гітлераўцаў з нашай зямлі.

У Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь захоўваюцца 2897 крымінальна-следчых спраў на нацысцкіх вайсковых злачынцаў, перададзеных у свой час з Цэнтральнага архіва Камітэта дзяржаўнай бяспекі. Звесткі з іх таксама былі ўключаныя ў зборнікі. Падчас работы над серыяй архівістам удалося ўдакладніць колькасць спаленых нацыстамі вёсак Беларусі — 9319. Таксама была сістэматызаваная інфармацыя пра 493 месцы прымусовага ўтрымання і знішчэння мірных грамадзян.

### АДКРЫЦЦІ НА МЕСЦЫ ТРАГЕДЫІ

Начальнік упраўлення па наглядзе за расследаваннем асабліва важных спраў Генеральнай пракуратуры, кіраўнік следчай групы па расследаванні крымінальнай справы аб генацыдзе беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны Валерый Талкачоў падзяліўся, што калегі з Расійскай Федэрацыі ў пачатку снежня перадалі Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь каля 20 гігабайт новых алічбаваных архіўных звестак, у тым ліку трафейныя дакументы вермахта.

Наогул жа новыя паступленні адбываюцца штомесяц: створаныя сумесныя рабочая група з расійскай Генпракуратурай і следчая група са Следчым камітэтам Расійскай Федэрацыі. Як паказваюць вынікі расследавання, маштаб трагедыі нашмат большы, чым лічылася раней. Высвятліць новыя факты ўдаецца дзякуючы цеснаму супрацоўніцтву гісторыкаў і архівістаў, прадстаўнікоў зацікаўленых міністэрстваў і ведамстваў, удзельнікаў пошукавага руху і проста неабыякавых грамадзян. Як адзначыў Валерый Талкачоў, яго калегі атрымліваюць мноства зваротаў, і на сёння дапытаныя ўжо больш за пятнаццаць тысяч сведак, у тым ліку і пацярпелыя ад нацысцкіх рэпрэсій.

Напрыклад, менавіта падчас работы над гэтай серыяй зборнікаў удалося высветліць дакладнае месца пахавання ахвяр нацызму на дзявятым кіламетры шашы Мінск — Масква за сталічным раёнам Уручча. Ужо даўно было вядома, што тут ляжаць астанкі дзясяткаў тысяч савецкіх ваеннапалонных і мірных жыхароў. У пасляваенныя гады на ўзбочыне шашы быў узведзены манумент у памяць аб ахвярах, але канкрэтнае месца іх пахавання да апошняга часу заставалася неўстаноўленым. У выніку супрацоўніцтва Генеральнай пракуратуры, 52-га асобнага спецыялізаванага пошукавага батальёна і вайсковых тапографаў пахаванні ўдалося адшукаць, цяпер ужо высветленае месцазнаходжанне трох з сямі задакументаваных пасля вайны ям-магіл.

> Складальнікі зборнікаў рабілі адмысловы акцэнт на публікацыі не толькі савецкіх, але і нямецкіх трафейных дакументаў — інфармацыя аб злачынствах пацвярджаецца нават у запісах, зробленых самімі акупантамі.

### УСЕБАКОВЫЯ ЗВЕСТКІ

Вядучы навуковы супрацоўнік аддзела публікацый Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь Вячаслаў Селяменеў нагадаў, што архівам за гады існавання незалежнай краіны выдадзены больш за два дзясяткі зборнікаў дакументаў, прысвечаных злачынствам нацыстаў на тэрыторыі Беларусі, у тым ліку Халакосту, угону насельніцтва на прымусовыя работы, карным аперацыям гітлераўцаў. Асобныя зборнікі дакументаў распавядаюць аб трагедыі лагераў у Малым Трасцянцы і Азарычах. Акрамя таго, Беларусь з'яўляецца адзінай з постсавецкіх рэспублік, дзе створаная база звестак аб вёсках, спаленых падчас нацысцкай акупацыі, у тым ліку разам з жыхарамі.

Кожны са зборнікаў серыі складаецца з двух раздзелаў. Першы апавядае аб нацысцкай палітыцы генацыду і выпаленай зямлі і змяшчае дакументы, якія распавядаюць пра злачынствы, здзейсненыя гітлераўцамі і іх памагатымі. Другі раздзел прысвечаны пасляваеннаму расследаванню ваенных злачынстваў. Складальнікі зборнікаў рабілі адмысловы акцэнт на публікацыі не толькі савецкіх, але і нямецкіх трафейных дакументаў, каб такім чынам верыфікаваць прыведзеныя ў іх звесткі і падкрэсліць, што інфармацыя аб злачынствах пацвярджаецца нават у дакументах, зробленых самімі акупантамі.

Напрыканцы кожнага зборніка змешчаныя дадаткі, якія сістэматызуюць звесткі аб месцах прымусовага ўтрымання і забойства мірных грамадзян, у тым ліку месцах масавага знішчэння і дэпартацый яўрэяў, аб найбольш буйных нямецкіх карных аперацыях і вёсках, спаленых акупантамі. Зборнікі ўключаюць таксама ілюстрацыйны блок, заснаваны на здымках з фондаў Беларускага дзяржаўнага архіва кінафотадакументаў, які змяшчае як фотасведчанні нацысцкіх злачынстваў, так і прыклады ўшанавання памяці іх ахвяр. Усе кнігі серыі апублікаваны на партале "Архівы Беларусі" і сайце Нацыянальнага архіва, дзе азнаёміцца з імі можа кожны ахвочы.

Зборнікі дакументаў, што змяшчаюць жывыя сведчанні відавочцаў аб падзеях часоў нацысцкай акупацыі, могуць зрабіцца каштоўнымі дапаможнікамі для гісторыкаў і краязнаўцаў, якія маюць цудоўную магчымасць працягнуць справу даследавання і высвятлення лёсаў ахвяр вайны ў сваіх родных мясцінах. Архіўныя дакументы складаюць базу любых даследаванняў, часта з'яўляючыся іх асновай. Але яшчэ большай карысці ў высвятленні ўсіх абставін гістарычных падзей можна дамагчыся пры спалучэнні інфармацыі з гэтага віду крыніц са звесткамі, якія здольныя паведаміць мясцовыя жыхары, сведкі трагічных падзей альбо нават іх нашчадкі. Застаецца спадзявацца, што зборнікі серыі "Без тэрміну даўнасці. Беларусь" скіруюць увагу даследчыкаў на раней невядомыя і малавывучаныя дэталі падзей часоў Другой сусветнай вайны.

**Антон РУДАК**